УДК 808.545-057.875

В. К. Мароз, дацэнт

# МЕТАДЫЧНАЯ КАНЦЭПЦЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ ЧЫТАЛЬНІКАЎ У СТУДЭНЦКАЙ АЎДЫТОРЫІ

Methodological conception of organization and realization among the students a competition in recitation is aimed to broaden a range of intellectual activity, helps to enactive patriotic feelings to native word. A technology of realization of conception provides texts accumulation, understanding it in compliance with own ideas, referring moral norms to own principles. Educative orientation of eloquent recitation allows to direct person's consciousness beyond narrow interests. It permits to join by the means of national to the world cultural traditions, to feel oneself being in a field of modern age problems.

**Уводзіны.** Сама задума распрацаваць метадычную канцэпцыю па арганізацыі і правядзенні сярод студэнцкай моладзі чытальніцкіх конкурсаў узнікла даўно. Рэалізацыю намераў паскорылі тыя змены, што адбыліся два гады таму ў планаванні і выкладанні курса «Беларуская мова» на спецыяльных факультэтах тэхнічных навучальных устаноў. Скарачэнне колькасці гадзін практычных заняткаў да 34 на семестр, адсутнасць лекцыйнай формы навучання падштурхнула да пошукаў дзейсных формаў актуалізацыі камунікатыўных навыкаў студэнтаў.

Вуснае чытанне як адзін з дыдактычных прыёмаў навучання і дэкламацыя (выразнае чытанне) як форма праверкі разумовых і творчых здольнасцей праходзяць праз усю гісторыю беларускай педагагічнай думкі. Так, А. Доўгірд (1776–1835), беларускі філосаф-педагог, лічыў, што інтэлект і пачуцці чалавека фарміруюцца ў пастаянных практыкаваннях праз шматразовае паўтарэнне і тым самым запісваюцца ў душы і памяці, ствараючы аснову для перакананняў. Фарміраванне характару і душы чалавека, развіццё яго задаткаў, выяўленне таленту немагчымыя без эстэтычнага ўздзеяння слова. Прырода чалавечага інтэлекту раскрываецца праз абуджэнне высокіх пачуццяў, штуршком да чаго служыць музыка, жывапіс, скульптура. Але найвышэйшай праявай мастацкай вобразнасці традыцыйна лічыцца паэзія, «яна распасцірае сваё панаванне на ўвесь свет, абуджае найлепшае ў чалавеку, выхоўвае і ўзвышае яго сэрца і душу» [1]. Маючы на ўвазе гістарычную пераемнасць педагагічных традыцый БДТУ, дарэчы згадаць, напрыклад, што ў Горы-Горацкай земляробчай школе ад 40-х гадоў XIX ст. дзейнічалі гурткі па праблемах агранаміі і рускага, нямецкага і французскага чытання [2]. У XIX – першай палове XX стст. дэкламаванне вершаў перайшло ў народную традыцыю, калі «пад стрэхамі вясковых хат» загучалі творы на беларускай мове. Завучванне тэкстаў напамяць застаецца і ў сучасным педагагічным арсенале школы і вышэйшых навучальных устаноў.

**Асноўная частка.** Само паняцце *канцэпцыі* звязваецца з сістэмай поглядаў на сутнасць з'яў, з прынцыпамі рэалізацыі пэўнай дзейнасці. Метадычная канцэпцыя арганізацыі і правядзення конкурсу чытальнікаў уяўляе сабой такі спосаб забеспячэння педагагічнага працэсу, які рэалізуецца паводле вызначаных прынцыпаў і дыдактычных прыёмаў, арыентаваных на прагназаваны вынік. Мэтай падрыхтоўчай працы і правядзення конкурсу чытальнікаў з'яўляецца наладжванне сумеснай дзейнасці выкладчыка роднай мовы і студэнтаў па адборы тэкстаў для дэкламацыі. Тут мэтазгодна кіравацца *прынцыпам нацыянальна-культурнага цэнтрызму.* У навучанні і выхаванні ён спрыяе ўспрыняццю ўласнай нацыянальнай культуры як феномена, які ацэньваецца і ўсведамляецца ў разнастайным сучасным свеце па сваіх адметных крытэрыях, забяспечвае выхаванне асобы паводле найлепшых грамадзянскіх традыцый. Тут важна мець на ўвазе такія творы беларускага фальклору і класічнай літаратуры, якія валодаюць магутным духоўна-культурным патэнцыялам і выяўляюць высокія маральна-этычныя традыцыі беларускага народа.

Апрабацыя канцэптуальных падыходаў была распачата ў межах арганізацыі студэнцкіх канферэнцый па беларускай мове. З 2003 г. яны пачалі праводзіцца на ўсіх патоках факультэтаў ТТЛП, ХТіТ, ІЭФ. Ставілася мэта: праз падрыхтоўку дакладаў на беларускай мове пашыраць і развіваць кагнітыўную (пазнавальную) функцыю сучаснай беларускай літаратурнай мовы, а праз дэкламацыю (мастацкае чытанне) дэманстраваць высокую эстэтычную сутнасць беларускага слова, прывіваць моладзі добры густ, выпрацоўваць на ўзорных тэкстах крытэрыі ацэнкі мастацкіх твораў. Першая такая канферэнцыя да 85-годдзя заслужанага дзеяча навукі Беларусі, доктара філалагічных навук, прафесара Фёдара Міхайлавіча Янкоўскага прадугледжвала ў роўнай меры як асвятленне навуковых дасягненняў вучонага, так і мастацкае чытанне яго літаратурных абразкоў, эсэ, апавяданняў (па выніках канферэнцыі кожны ўдзельнік атрымаў том выбраных твораў Ф. Янкоўскага «З нялёгкіх дарог»). Мастацкая проза Ф. Янкоўскага, якая спалучыла ў сабе шырокі пазнавальны змест і глыбокае маральна-этычнае ўздзеянне, спрыяе абуджэнню цікаўнасці да

адметных лексічных пластоў беларускай мовы, садзейнічае развіццю патрыятычных настрояў, умацоўвае пачуццё нацыянальнай годнасці: «*На світанні і на змярканні, золкаю ці ведранаю ноччу, хмурым ці сонечным днём – заўсёды і ўсюды жыццё маё не будзе дзеля кавалка хлеба; найгалоўнейшае, ад чаго не адступлюся, хоць і апынуся ці ў акопах, ці ў шпіталі, хоць буду халодны ці галодны, – маё роднае слова, родная натура вялікага краю, родная Беларусь. Вы – мая радасць і ўцеха, вы – мая скруха і боль, вы – маё шчасце, жыццё*»; «*Вынішчэнне здабыткаў народа (а яно, бязлітаснае, жорсткае вынішчэнне, прыходзіла за доўгую гісторыю Беларусі многа разоў і з розных бакоў), вялікія страты краю (ад спальвання гарадоў, мястэчкаў, вёсак, пасёлкаў да людаедскага забойства гітлераўцамі ляснічых і настаўнікаў, пчаляроў і плытагонаў, бабулек і ўнукаў-немаўлятак) клікалі да дзеяння і да настойлівага роздуму, непазбыўных клопатаў розуму, душы і сэрца: невымерна цяжкі быў лёс роднай Беларусі, а яна стварыла неацэнную культуру, вартую замілавання і захаплення, высокага гонару і найвышэйшай ацэнкі*». Абагульняльным акордам да навуковых выступленняў на канферэнцыі з'явіўся верш Ніны Мацяш «Памяці Фёдара Міхайлавіча Янкоўскага»: *«Бываюць душы – светлата сама, // З нялёгкім конам – цемнату адпрэчваць. // Вас Беларусі выкахала Вечнасць, // Але ў гурмы пытаць пра Вас – дарма: // Не ведае, не прыгадае Вас, // Таго, хто так нямодна, далікатна, // Нястомна ў час, да ганьбы духастратны, // Вялічыў дух, каб ён ушчэнт не згас, // Каб выспявала, як зара, пара, // Калі на мову сэрца і служэння // Высока зашугае ўспалымненне // І бел-чырвона-белага кастра. // Калі, стваральнай мудрасцю жывы, // Згартуюць люд Асвета, Памяць, Вера. // ...І недзе там, у яснасяйных сферах, // За свой народ усцешыцеся Вы!» (1991).*

З наступных мерапрыемстваў найбольш насычанай чытальніцкім кампанентам была навукова-практычная канферэнцыя «Янка Купала – вялікі нацыянальны паэт» (да 125-годдзя народнага паэта Беларусі). Яна прадугледжвала спалучэнне тэматыкі студэнцкіх навуковых паведамленняў з дэкламацыяй адпаведных мастацкіх твораў: даклад «Мова – душа самой душы народа» – верш Янкі Купалы «Роднае слова» (Касянчук А. У. – ХТіТ, 4 к.); даклад «Янка Купала ў ацэнках беларускіх пісьменнікаў» – верш Уладзіміра Караткевіча «У тую ноч» (Рагляк К. А. – ХТіТ, 1 к.); даклад «Беларусь у творах Янкі Купалы» – верш Уладзіміра Караткевіча «На Беларусі Бог жыве» (Шпаковіч Н. А. – ХТіТ, 5 к.); даклад «Традыцыі Янкі Купалы ў творчасці Уладзіміра Караткевіча» – верш Уладзіміра Караткевіча «Дзе мой Край?» (Войтаў П. А. – ХТіТ, 2 к.); даклад «З гісторыі тэатра імя Янкі Купалы» – верш Янкі Купалы «А яна...» (Карасевіч І. В. – ХТіТ, 1 к.).

Веданне разнастайных тэкстаў на беларускай нацыянальна-дзяржаўнай мове, уменне іх дакладна перадаць (пераказаць) выступае дзейсным сродкам маральна-этычнага выхавання асобы, выпрацоўвае навыкі лагічнага і дакладнага выказвання ўласных думак у арыентацыі на ўзоры літаратурнай мовы. Таму паводле распрацаванай канцэпцыі прадугледжваецца ўвядзенне ў структуру практычных заняткаў абавязковага кампанента для запамінання ці завучвання на памяць, які выступаў бы квінтэсенцыяй дыдактычнага напаўнення тэмы. На першым этапе студэнтам прапануецца прачытаць творы, засвоеныя ў школе (тэма заняткаў: лексіка беларускай мовы); на другім – завучыць мастацкі твор (на ўласны выбар ці з прапанаваных выкладчыкам) з мэтай засваення асноўных нормаў вымаўлення гукаў і спалучэнняў гукаў (тэма заняткаў: беларуская арфаэпія); на трэцім – правядзенне ў групе выніковага конкурсу чытальнікаў паводле адбору, які праводзіўся на папярэдніх двух этапах.

У аснове выкладчыцкага адбору матэрыялу ляжыць *прынцып мэтазгоднасці*, які ў адных выпадках забяспечваецца праз ***супастаўленне***: да прыкладу, артыкул 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (*Дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы*) абавязкова дапаўняецца 1-м параграфам IV раздзела Статута ВКЛ 1588 года: («*А писар земский маеть по-руску литерами и словы рускими все листы, выписы и позвы писати, а не иншым языком и словы»)* і цытатай Льва Сапегі з прадмовы да Статута *(А если которому народу встыд прав своих не умети, поготовю нам, которые не обчым яким языком, але своим власным права списаные маем и каждого часу, чого нам потреба ку отпору всякое кривды, ведати можем*); у іншых – праз ***параўнанне***: выказванне Янкі Купалы пра беларускую мову («*Для мовы, гэтай выразіцелькі душы і думак чалавека, не патрэбна ні скіпетраў, ні каронаў, як не патрэбна для сонца якога-небудзь яшчэ пазалочанага абруча, рамак. Сонца само па сабе адна аздобнасць – і золата, і брыльянт. Таксама і мова якога-небудзь народа ёсць для яго і скіпетрам, і каронай, яго нічым не апаганенай аздобнасцяй*» (Янка Купала «Ці маем мы права выракацца роднай мовы») параўноўваецца з цытатай Аляксандра Ельскага: «*Родная мова ў дакладным значэнні ёсць самая любімая спадчына нацыі: праз яе найлягчэй пранікнуць у душу нацыі, закрануць пачуцці, праясніць розум, падштурхнуць адпаведную думку, заклікаць да дзеяння, змагацца са страсцямі, ствараць дабрачыннасці*» (Аляксандр Ельскі, беларускі этнограф, пісьменнік, эканаміст XIX ст.); а таксама праз ***аналогію***: думка Ф. Скарыны «*Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птицы, летающие по*

*воздуху, ведають гнёзда своя; рыбы, плавающие по морю и в реках, чують виры своя. Тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены суть по бозе к тому месту великую ласку имають*») лагічна звязваецца з выказваннем У. Караткевіча: «*Якая яна, мая зямля? Гэта залатыя палі збажыны з сінімі вочкамі васількоў, светлыя ад бяроз гаі, што аглухлі ад птушынага звону, і пушчы, падобныя на гатычныя храмы, пушчы, дзе горда нясуць свае кароны алені. Гэта бясконцыя жылы рэк, у якіх плешчуцца бабры і рыба на захадзе сонца, і гэта амаль адзінаццаць тысяч азёр, чыстых, як усмешка дзіцяці. ...Пранікніцеся любоўю да маёй роднай Беларусі, людзі. Велічная і гордая, яна таго вартая*» (прадмова да кнігі «Памяць зямлі беларускай»). Светапоглядныя асновы народнай маралі, нормы сужыцця ў грамадстве, станоўчыя і адмоўныя якасці асобы, закладзеныя ў беларускіх прыказках, прымаўках, крылатых выслоўях, таксама абавязковы кампанент для запамінання і ўзнаўлення на занятках: *Ідзі з людзьмі – не згубішся*; *Не частуй ты мяне піўцом, вінцом – пачастуй мяне добрым слаўцом*; *Ядуць на свеце хлеб траякі: белы, чорны і ніякі*; *Божа! Гэткі свет тут моц стварыла твая!* (Янка Купала); *Совы і начніцы сонца не бачаць* (Янка Купала); *Што мацней ад грамады!* (Якуб Колас), *Ці ж мы, хлопцы, рук не маем, // Ці ж нам сілы Бог не даў, // Каб над нашым родным краем // Промень волі не блішчаў?!* (Якуб Колас); *Не, не развітаюся ніколі // З родным краем, дзе так светла нам. // Проста я люблю яго да болю // І з любоўю дзецям перадам* (Пімен Панчанка) і інш.

Тэхналогія рэалізацыі прапанаванай метадычнай канцэпцыі прадугледжвае назапашванне тэкстаў, асэнсаванне іх у адпаведнасці з уласнымі ўяўленнямі, суаднясенне сістэмы поглядаў розных аўтараў, супастаўленне засвоеных маральных нормаў з асабістымі прынцыпамі. *Дамінантай* выбіраецца сам *працэс падрыхтоўкі*, а не вынік, што прадугледжвае дзейсны падыход студэнтаў да арганізацыі самога конкурсу чытальнікаў. Асноўнымі *прынцыпамі*, пакладзенымі ў аснову метадычнай канцэпцыі, з'яўляюцца прынцып *адзінства навучання і выхавання*, *адзінства свядомасці і дзейнасці*, *прынцып раскрыцця здольнасцей*, *абумоўленасці навучальнага працэсу мэтамі маральнага выхавання, адпаведнасць адукацыйных прыёмаў логіцы маральнага развіцця індывідуума*.

Рэалізацыя названых прынцыпаў прадугледжвае такія метадычныя прыёмы: 1) мадэляванне падрыхтоўчай дзейнасці ў межах вучэбнага курса беларускай мовы, што складае аснову ўзаемасувязі паміж навучаннем і выхаваннем; 2) дзейнасць студэнтаў актуалізуе не толькі праяўленне мастацкага густу і чытальніцкіх здольнасцей, але і набыццё новых здольнасцей (прапануецца пакласці тэкст на музыку, паспрабаваць сябе ў вакальных ці калектыўных спевах, праявіць арганізацыйныя навыкі пры падрыхтоўцы тэатралізаванага калектыўнага чытання вялікіх тэкстаў: паэмаў Янкі Купалы «На Куццю», «Яна і я», раздзелаў з паэмаў Якуба Коласа «Сымон-музыка» і «Новая зямля», «Балады аб чатырох заложніках» Аркадзя Куляшова, верша Уладзіміра Караткевіча «Паўлюк Багрым» і інш.; 3) спалучэнне пэўных формаў навучальна-пазнавальнай дзейнасці з эстэтычнымі прыёмамі падачы тэмы стварае адметны настрой у аўдыторыі, напаўняе адукацыйны працэс патрэбнай і важнай студэнту інфармацыяй, замацоўвае маральныя рэфлексіі, скіраваныя на крытычную ацэнку духоўных каштоўнасцей, надае выхаваўчаму працэсу мэтанакіраваны, пастаянны характар, пазбаўлены дэкларатыўнасці і навязвання моладзі педагагічных тэмаў і стэрэатыпаў.

**Заключэнне.** Найвышэйшай мэтай педагогікі было і застаецца імкненне гарманічна спалучыць у асобе маральны і інтэлектуальны пачатак, сумясціць якасці дабрачыннасці з прагматычна-рацыянальнай арыентацыяй у прафесійнай дзейнасці, зрабіць веды, доўг і сумленне асноўнымі крытэрыямі маральнасці ўчынкаў. Выхаваўчая накіраванасць выразнага чытання дазваляе вывесці свядомасць асобы па-за межы вузкаспецыяльных прафесійных інтарэсаў, пашырыць успрыняцце свету да агульнакультуралагічных каштоўнасцей. Гэта дапамагае праз прызму нацыянальнага далучыцца да культурных традыцый свету, адчуць сябе ў коле творчых працэсаў сучаснасці, суаднесці сваю скіраванасць з узорамі архетыпаў у іншых галінах чалавечай дзейнасці.

## Літаратура

1. Дорошевич, Э. Очерки этической мысли Белоруссии / Э. Дорошевич, В. Конон. – Минск: Искусство, 1972.

2. Храпков, С. А. Первый в России / С. А. Храпков. – М.: Колос, 1981.